**Як стварыць аптымальныя ўмовы для засваення вучнямі тэарэтычнага матэрыялу на ўроках англійскай мовы? Якія педагагічныя тэхналогіі, метады, прыёмы выкарыстоўваць у падрыхтоўцы вучняў да міжкультурнай камунікацыі? Якія сродкі навучання выбраць для развіцця кагнітыўных працэсаў у вучняў? Пошук адказаў на вышэйпералічаныя пытанні дазволіў зрабіць выснову, што развіццю кагнітыўных працэсаў у вучняў спрые выкарыстанне ў адукацыйным працэсе вэб-сэрвісаў — ідэнтыфікаваных унікальных вэб-адрасоў праграмных сістэм са стандартызаванымі інтэрфейсамі.**

# Для развіцця кагнітыўных працэсаў — вэб-сэрвісы

Лічым, што ў адукацыйным працэсе неабходна арыентавацца на мабілізацыю кагнітыўных працэсаў і імкненняў вучняў, на абуджэнне іх цікавасці да пазнання, на станаўленне ўласных спосабаў дзейнасці і развіццё ўмення канцэнтравацца на творчым працэсе. У сваёй педагагічнай дзейнасці па развіцці кагнітыўных працэсаў у вучняў 9—11 класаў абапіраемся на прынцыпы і ідэі, выкладзеныя ў працах М.І.Запрудскага, А.В.Хутарскога.

Вядома, што кампетэнтны ўдзельнік камунікацыі павінен умець "пераключацца" з адной кагнітыўнай сістэмы на іншую. Можна зрабіць выснову, што чалавек, які характарызуецца высокім узроўнем развіцця кагнітыўных працэсаў, здольны адэкватна ўспрымаць інфармацыю, аналізаваць матэрыял, зыходзячы са створаных умоў, пастаўленых задач і асабістых матываў.

Варта адзначыць, што выкарыстанне вэб-сэрвісаў пры навучанні англійскай мове дазваляе не толькі вырашаць тыпавыя прадметныя задачы, але і рэалізоўваць механізмы самазмянення і самаразвіцця вучняў. На розных этапах урока (сумеснай мэтапастаноўкі і пастаноўкі вучнямі ўласных мэт пазнавальнай дзейнасці, праверкі дамашняга задання, актуалізацыі і замацавання новага матэрыялу, падвядзення вынікаў урока, рэфлексіі) прымяненне вэб-сэрвісаў спрые рэалізацыі асобасна арыентаванага і кагнітыўнага падыходаў.

У глабальнай сетцы інтэрнэт існуе вялікі выбар тэхнічных і дыдактычных інструментаў медыяпрасторы, якія дазваляюць ствараць адукацыйныя прадукты і садзейнічаюць развіццю кагнітыўных працэсаў у вучняў.

Авалоданне англійскай мовай ва ўмовах прымянення пэўных вэб-сэрвісаў адбываецца натуральным шляхам, бо адпавядае ўсім прынцыпам асобасна арыентаванага навучання. Таму ўрокі, заснаваныя на выкарыстанні вэб-сэрвісаў, дазваляюць наблізіць абставіны да ўзроўню звычных, не губляючы сваёй вучэбнай накіраванасці. Вучні дзейнічаюць паводле зададзеных умоў, што дазваляе ўспрымаць асноўную інфармацыю, канцэнтравацца на пэўных дэталях, ацэньваць і аналізаваць матэрыял з улікам раней атрыманых ведаў.

**Успрыманне**, як адзін з галоўных кагнітыўных працэсаў, якія вызначаюць паспяховасць далейшай свядомай працы, патрабуе асаблівага падыходу да выбару вэб-сэрвісу. *www.Wordart.com* — інструмент для візуалізацыі матэрыялу, які дазваляе ўплываць на ўспрыманне вучняў. Воблака слоў, створанае з дапамогай дадзенага рэсурсу, з'яўляецца сродкам падачы матэрыялу па тэме як на пачатковым этапе для ўвядзення ў маўленчую сітуацыю, так і для фармулёўкі высноў на заключным этапе ўрока. Тэхнічныя магчымасці гэтага вэб-сэрвісу здольны надаць воблаку форму аб'екта, які максімальна адлюстроўвае камунікатыўную сітуацыю, і афарміць яго ў зручным для ўспрымання выглядзе. Пры падачы дадзенага медыяпрадукту прапаную вучням сфармуляваць камунікатыўную сітуацыю ўрока, скласці паведамленне па тэме з апорай на прапанаваныя словы або выказацца па праблеме. Фотакалажы, створаныя на медыяплатформе *www.Canva.com*, таксама дазваляюць навучэнцам успрымаць матэрыял цэласна.

Для ўздзеяння на **ўспрыманне** розных груп вучняў (візуалаў і аўдыялаў) выкарыстоўваем камп'ютарную графіку, створаную на аснове вэб-сэрвісу *www.Voki.com*, тэхнічныя магчымасці якога дазваляюць стварыць персанаж, узнавіць гукавы рад і задаць патрэбныя характарыстыкі. Створаны відэарад уплывае на працэс апрацоўкі і інтэрпрэтацыі інфармацыі.

Адукацыйныя прадукты, створаныя з дапамогай гэтых вэб-рэсурсаў, дазваляюць факусіраваць увагу вучняў на пэўнай дэталі. Персанаж можа расказаць вучням, напрыклад, пра палітычную сістэму Вялікабрытаніі, а распрацаваная сістэма практыкаванняў перадтэкставага этапу дапамагае канцэнтраваць увагу вучняў на пошуку адказу ў працэсе праслухоўвання. Для актывізацыі ўвагі на ўроку выкарыстоўваем матэрыял, створаны з дапамогай вэб-сэрвісу *www.En.islcollective.com*, тэхнічныя магчымасці якога дазваляюць афармляць рэплікі персанажаў у выглядзе відэапазлаў. Прынцыпы навізны, інтэнсіўнасці стымулаў і нечаканасці падачы матэрыялу спрыяюць рэалізацыі пастаўленай задачы. Зыходзячы з практыкі, можна зрабіць выснову, што выкарыстанне вэб-сэрвісу *www.En.islcollective.com* — эфектыўны сродак стварэння камунікатыўнай сітуацыі на ўроку. Вучні самастойна рэгламентуюць час выканання задання і ажыццяўляюць выбар лексічных адзінак.

**Уяўленне** — магутны псіхалагічны фактар у навучанні англійскай мове, які трэба пастаянна развіваць. Урок замежнай мовы першапачаткова прапануе навучэнцам унікальную магчымасць праявіць сваё ўяўленне, бо камунікатыўныя сітуацыі, што ствараюцца настаўнікам, не заўсёды абапіраюцца на рэальны вопыт вучняў, хоць прадугледжваюць прымяненне гэтых навыкаў у будучыні. Аптымальным спосабам развіцця ўяўлення вучняў з'яўляецца выкарыстанне магчымасцей розных анлайн-рэсурсаў вэб-сэрвісаў, багатых на разнастайныя опцыі па стварэнні платформы для пэўных відаў маўленчай дзейнасці. Напрыклад, фотакалажы, якія ствараюцца на сайце *www.Kizoa.com* (на аснове фотаэлементаў па пэўнай тэме), спрыяюць прадукцыйнаму замацаванню вывучанага матэрыялу і актывізацыі дзейнасці вучняў. Гледзячы на карцінку, вучні ў парах або ў групах складаюць уласнае выказванне па праблеме, абмяркоўваюць і аналізуюць меркаванне суразмоўцаў. Напрыклад, на аперацыйна-дзейнасным этапе, этапе рэфлексіі вучням прапануецца структураваць матэрыял, абапіраючыся на карцінкі фотакалажу, звязаныя з пройдзеным на ўроку матэрыялам. Кожны з вучняў, актуалізуючы ўласны вопыт і пасільна аперыруючы новымі лексічнымі адзінкамі, мае магчымасць сфармуляваць маналагічнае выказванне. Пры гэтым настаўнік выконвае ролю назіральніка, што робіць працэс абмеркавання жывым, нязмушаным і натуральным. Падобныя заданні таксама ствараюцца на аснове анлайн-рэсурсаў *www.Genial.ly* і *www.Canva.com.*

Для камунікацыі на замежнай мове патрабуецца арыентацыя вучняў на засваенне вялікага аб'ёму разнастайнага матэрыялу, трывалага захоўвання яго ў **памяці**, хуткага і эфектыўнага выкарыстання ў вырашэнні вучэбных і практычных задач. Неад'емнай часткай вучэбнай дзейнасці з'яўляецца асэнсаванне і замацаванне ў свядомасці вучняў вывучанага на ўроку матэрыялу. На ўроках англійскай мовы ў многіх вучняў узнікаюць цяжкасці пры першасным успрыманні, наступным запамінанні і ўзнаўленні лексічных адзінак. На нашу думку, рэсурс *www.Quizlet.com*, опцыі якога дазваляюць ствараць навучальныя гульні на аснове flash-карт, з'яўляецца эфектыўным сродкам трэніроўкі памяці. Для гэтага ствараюцца розныя flash-карты, у якіх навучэнцам прапаноўваецца суаднесці лексічныя адзінкі з іх выявамі або азначэннем.

Для стварэння інтэрактыўных заданняў выкарыстоўваем магчымасці інтэрактыўных трэнажораў на платформах *www.LearningApps.org, www.Linguahouse.com, www.Liveworksheets.com і www.Wordwall.net.* Шырокі спектр практыкаванняў дае магчымасць вар'іраваць матэрыял у залежнасці ад зместу, задач урока і псіхалагічных асаблівасцей вучняў. Напоўненасць практыкаванняў, выразныя вучэбныя ўстаноўкі, алгарытмічнасць выканання інтэрактыўных заданняў спрыяюць пазнавальнай актыўнасці вучняў. Раней атрыманыя веды прымаюць форму адпрацаваных дзеянняў, якія паслядоўна выконваюцца вучнямі: успрыманне, апрацоўка, аналіз, выкананне. Вучань сам прымае рашэнне па выкананні задання, што, у сваю чаргу, надае дзейнасці аўтаномнасць і магчымасць самакантролю. Гэта дазваляе стварыць сітуацыю поспеху для кожнага вучня і ажыццяўляць асобасна арыентаваны падыход у выкладанні англійскай мовы.

Развіццё **мыслення** напрамую звязана з асноўным пазнавальным працэсам. Існуе велізарны выбар прыёмаў, якія спрыяюць развіццю памяці. У прыватнасці, усё большую папулярнасць набываюць логіка-сэнсавыя мадэлі, інтэлект-карты і інфаграфіка, якія шырока прымяняюцца на ўроках. Лічым выкарыстанне інтэлект-карт і інфаграфікі аптымальным спосабам для запамінання, сістэматызацыі інфармацыі і лагічнага яе ўзнаўлення. Для інтэлект-карт і інфаграфікі выкарыстоўваем анлайн-рэсурсы *www.SpiderScribe.com* і *www.Pinterest.com*. Падобныя вэб-сэрвісы спрыяюць уключэнню ў работу ўсіх вучняў, актывізацыі ведаў школьнікаў па тэме, развіццю вуснага і пісьмовага маўлення вучняў як анлайн, так і афлайн. Прапануем навучэнцам скласці інтэлект-карты на ўроку або выканаць гэтую работу самастойна ў якасці дамашняга задання, зыходзячы з уласных інтарэсаў і псіхалагічных асаблівасцей.

Для развіцця мыслення вучняў выкарыстоўваем вэб-квест *www.Questgarden.com*: вучні падчас праходжання ўсіх яго этапаў (у залежнасці ад пастаўленай перад імі вучэбнай праблемы) прапануюць сваё рашэнне праблемы ў выглядзе вуснага выступлення, камп'ютарнай прэзентацыі, эсэ, вэб-старонкі і г.д.

Кожны з апісаных вышэй вэб-сэрвісаў можа з'яўляцца сродкам развіцця кагнітыўных працэсаў у вучняў на розных этапах урока ў залежнасці ад яго мэты і зместу. Працуючы па дадзенай тэме, мы зрабілі спробу апісаць выкарыстанне адабраных вэб-сэрвісаў на розных этапах урока англійскай мовы.

| Этап урока | Назва вэб-сэрвісу | Задачы этапа |
|---|---|---|
| Арыентацыйна-матывацыйны | *www.Voki.com* (інтэрактыўная прэзентацыя) | Увядзенне ў камунікатыўную сітуацыю, вызначэнне тэмы, пастаноўка мэты ўрока |
| | *www.Wordart.com www.Wordcloud.com* (воблака слоў) | |
| | *www.Rebus1.com* (рэбусы) | |
| | *www.Canva.com* (фотакалаж) | |
| Аперацыйна-пазнавальны | *www.Prezi.com www.Genial.ly* (інтэрактыўная прэзентацыя) | Актуалізацыя вопыту вучняў; першаснае прадстаўленне матэрыялу для далейшага маўленчага ўзаемадзеяння |
| | *www.Cambridge www.Dictionary+plus org* (інтэрактыўная віктарына) | |
| | *www.Youtube.com* (відэаролікі) | |
| | *www.Voki.com* (кагнітыўная камп'ютарная графіка) | |
| | *www.Quizlet.com* (flash-карты) | Увядзенне і першаснае замацаванне лексікі |
| Аперацыйна-дзейнасны | *www.LearningApps.org www.Linguahouse.com www.Liveworksheets.com www.Wordwall.net* (інтэрактыўныя трэнажоры) | Выкананне практыкаванняў для работы з лексікай |
| | *www.En.islcollective.com www.H5P.org www.Edpuzzle.com* (відэа-пазлы) | Актыўная маўленчая дзейнасць, узаемадзеянне ў пары/ групе, развіццё маналагічнага і дыялагічнага маўлення |
| | *www.SpiderScribe.net* (інтэлект-карты) | |
| | *www.Pinterest.com* (інфаграфіка) | |
| | *www.Kizoa.com* (слайд-шоу) | |
| | *www.Flippity.com* (інтэрактыўны храналагічны ланцужок (Timeline)) | |
| Ацэначна-рэфлексіўны | *www.learnis.ru* (квесты) | Фармулёўка вынікаў дзейнасці вучняў, абагульненне атрыманых ведаў па тэме |
| | *www.Questgarden.com* (квесты) | |
| | *www.SpiderScribe.net* (інтэлект-карты) | |

Падчас апрабацыі на ўроках англійскай мовы вышэйпералічаных вэб-сэрвісаў былі распрацаваны медыяпрадукты для адпрацоўкі камунікатыўных сітуацый. Некаторыя з іх прапануем вашай увазе.

| № п\п | Рэсурс | Камунікатыўная сітуацыя | Медыяпрадукт |
|---|---|---|---|
| 1. | *www.Wordart.com* — воблака слоў | Тэма "Адукацыя". 10 клас, "Сістэма адукацыі Рэспублікі Беларусь і Вялікабрытаніі" |  |
| 2. | *www.Flippity.com* — інтэрактыўны храналагічны ланцужок (Timeline) | Тэма "Навука і тэхніка", 10 клас. "Знакамітыя навукоўцы Рэспублікі Беларусь" |  |
| 3. | *www.Voki.com* — інтэрактыўная прэзентацыя | Тэма "Сацыякультурны партрэт Вялікабрытаніі", 11 клас. "Палітычная сістэма Вялікабрытаніі" |  |
| 4. | *www.Learnis.ru* — квесты | Тэма "Віды жылля", 10 клас. "Маё любімае месца ў кватэры" |  |
| 5. | *www.Questgarden.com* — падрыхтоўка праектаў | Тэма "Турызм", 11 клас. "Перспектывы развіцця турызму ў Беларусі" |  |
| 6. | *www.Kizoa.com* — фотакалаж, слайд-шоу | Тэма "Аўстралія", 11 клас. "Нацыянальныя святы Аўстраліі" |  |

Выкарыстанне вэб-сэрвісаў спрые пазнавальнай актыўнасці вучняў, павышае матывацыю да навучання. Тэарэтычны матэрыял засвойваецца вучнямі хутка і трывала, яны на занятках актыўныя, зацікаўленыя.

Аднак разам з пералічанымі перавагамі неабходна ўлічваць **наступныя цяжкасці**: педагог павінен быць мабільным і пастаянна цікавіцца новымі тэндэнцыямі ў медыяпрасторы; працэс распрацоўкі ўрокаў з выкарыстаннем вэб-сэрвісаў працаёмкі і займае даволі шмат часу; колькасць камп'ютараў у класе з выхадам у інтэрнэт не заўсёды адпавядае колькасці вучняў у групе; існуе верагоднасць, што па аб'ектыўных прычынах могуць адсутнічаць неабходныя ўмовы для правядзення ўрокаў з выкарыстаннем ІКТ (тэхнічная паломка ПК, адсутнасць паслуг ад правайдара); неабходна дакладна і прадумана выкарыстоўваць вэб-сэрвісы, каб не "перайграць" змест вучэбнага матэрыялу; неабходна строга вытрымліваць аптымальную шчыльнасць урока з выкарыстаннем ПК.

**Людміла КРЫВАЛЬЦЭВІЧ,**
**настаўніца англійскай мовы,**
**Настасся КРАЎЧУК,**
**настаўніца інфарматыкі гімназіі № 4 Мінска.**